«ДВАРАНСТВА» ДЛЯ... САБАКІ

«Лістапад» — гэта не толькі знакаміты міжнародны кінафестываль. Пад такой назвай у мінулую нядзелю ў Мінску прайшла Рэспубліканская выстаўка сабак. А днём раней — у суботу, у сталічным Палацы спорту таксама адбыліся спаборніцтвы за тытул чэмпіёнаў сярод прадстаўнікоў усіх сабачых парод, якіх гадуюць у нашай краіне. Згодна з каталогам, які быў надрукаваны да гэтай падзеі, на сабачыя рынгі гаспадары выводзілі больш за трыццаць парод — ад карлікавых шпіцаў і пінчараў, якія лёгка змяшчаюцца ў кішэні, да вялізных лабрадораў, пудзеляў і аўчарак, якім цесна нават у багажніку джыпа. Гэтую незвычайную выстаўку арганізавалі і правялі кіналагічнае аб'яднанне і рэспубліканскае таварыства аматараў жывёл «Сірыус», запрасіўшы да ўдзелу сабакаводаў нават з іншых краін — Казахстана, Расіі, Украіны.

— Беларускія выстаўкі маюць даволі высокі рэйтынг, і ўдзельнічаць у іх прэстыжна, — прызнаецца жыхарка казахскага горада Алматы Святлана Талстая і не без гонару дадае: — Мой гадаванец, ёркшырскі тэр'ер, стаў чэмпіёнам чарговы раз. Ён перамог ужо ў дзявятай краіне!

Кожны гаспадар, які прыводзіць свайго сабаку на такую выстаўку-конкурс, жадае, каб яго самы прыгожы і разумны сябар быў яшчэ і самы тытулаваны. Для поўнага шчасця.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Жывы свет

Нашы птушкі «заваёўваюць» Лімпапо

Беларуская зязюля Юлія перасекла 22-ю паралель паўднёвага паўшар'я і дасягнула Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі (ПАР). За тры гады сачэння за еўрапейскімі зязюлямі так далёка яшчэ не залятала ніводная птушка нашага кантынента, паведамілі рэдакцыі ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».



За апошнія некалькі дзён Юлія пераадолела больш за 1200 км і праляцела праз Зімбабвэ. Спецыялісты зафіксавалі, што беларуская птушка дабралася да поўначы ПАР і зараз знаходзіцца ў правінцыі Лімпапо. Апошні атрыманы рыдыёсігнал зафіксаваў, што птушка трымаецца недалёка ад вёскі Tshivhungweni, што за 16 кіламетраў ад знакамітай ракі Лімпапо. Гэтая мясцовасць знаходзіцца паміж дзвюма прыродаахоўнымі тэрыторыямі: прыродным рэзерватам Нванэдзі і знакамітым афрыканскім нацыянальным паркам Кругер.

Зязюля Юлія праляцела над ракой Лімпапо, і апошні раз спецыялісты «злавілі» радыёсігнал за некалькі кіламетраў ад яе. Рэльеф тут узгорысты, аснову раслiннасці складаюць велічныя баабабы, на адным з якіх, магчыма, зараз і сядзіць наша зязюля. Цікава, што ўсяго за шэсць кіламетраў адсюль расце самы вялікі баабаб ПАР — Сагале.

З кастрычніка ў гэтых мясцінах пачынаецца сезон дажджоў. Тэмпература паветра ў дзень трымаецца каля 33 цяпла, і амаль штодзень ідуць дажджы.

Магчыма, Юля не застанецца тут надоўга і паляціць у глыб краіны. Але больш цікава, ці паляцяць іншыя нашы зязюлі туды?

Сяргей КУРКАЧ.

■ Нефармат

Людская зайздрасць — цяжкі крыж



Два дні з перапынкамі чытала электронны дзённік Кацярыны Онахавай, маці 11 дзяцей з Пружанаў, вестка аб заўчаснай смерці якой не засталася незаўважанай ва ўсёй краіне. Гэтыя запісы ў руках добрага пісьменніка, відаць, маглі б стаць кнігай аб тым, якім высокадухоўным, высокаінтэлектуальным, творчым, ініцыятыўным чалавекам яна была, як будавала і ўладкоўвала свой дом, як любіла дзяцей. Яна не была чалавекам з правінцыі. У Мінску яны ці то збіраліся, ці то знялі кватэру, бо часта трэба было ездзіць на кансультацыі да ўрачоў з дзецьмі і самой. Мэблю і іншыя рэчы для дома куплялі пераважна ў сталіцы, а то і ў Маскве. Па інтэрнэце яна мела стасункі з многімі людзьмі, парадай дапамагала прыёмным бацькам. Умела жыць цікава, па некалькі разоў у год з дзецьмі адпачывала на моры. У адным з апошнім запісаў яна расказала пра яшчэ адну невялікую перамогу: паехала з дзецьмі ў Кіева-Пячорскую лаўру — а гэта 700 кіламетраў за рулём за дзень па добрых і не вельмі добрых дарогах! Яна вельмі любіла добрае кіно, прыгажосць вакол, дасціпны гумар. І была надзвычай ранімай. Ніхто ёй не суддзя, адзін толькі Бог...

Кацярына, несумненна, была яшчэ і моцным чалавекам, чалавекам з унутраным стрыжнем. Але, як сказала мая калега, тыя, што са стрыжнем, хутчэй ломяцца, астатнія пад жыццёвымі цяжкасцямі гнуцца. Дык вось, у яе запісах на фоне агульнай жыццясцвярджальнасці толькі дзе-нідзе праскоквалі інтанацыі вельмі стомленага ад людской нядобразычлівасці чалавека. Яна пісала аб тым, што яе планы па глабальных пераменах грамадскай думкі наконт прыёмнай сям'і пацярпелі поўны крах, пісала аб канфлікце ў паліклініцы, дзе яе пакрыўдзілі абразлівымі адносінамі да шматдзетнай сям'і... І такіх вось маленькіх крыўдных абраз — дзе словамі, а дзе касымі поглядамі — набярэцца за гады цэлы воз.

У Пружанах і цяпер абмяркоўваюць нядаўнюю трагедыю. Бібліятэкар раённай бібліятэкі Алена Мікалаеўна сказала так: «Мне проста сорамна за нашых людзей. Многія так і не змаглі зразумець, што людзі бяруць дзяцей, кіруючыся высокім душэўным парывам, а не меркантыльнымі планамі. Усё перамывалі косткі, шукалі выгаду: калі ўзялі дзяцей — значыць, шмат грошай атрымліваюць, нажываюцца на дзецях. Хіба можна раўняць людзей, якія ўсё жыццё прысвячалі дзецям, лячылі іх у лепшых клініках, бо амаль кожны з малых спачатку быў з дыягназам, з тымі нядбайнымі шматдзетнымі бацькамі, што атрымліваюць сацыяльныя кватэры і прапіваюць дапамогу? Гэтым трэба было помнік пасярод Пружанаў паставіць. А ў паліклініцы маглі б сапраўды замацаваць урача за гэтай сям'ёй, які б прымаў без чаргі. Бо калі ёй сядзець у чэргах да кожнага спецыяліста з кожным з дзяцей, дык на гэта маці 11 дзяцей і тыдня не хопіць!».

Чаго толькі не гаварылі пра гэтую сям'ю, якіх плётак не прыдумвалі! Здавалася б, у ціхім правінцыйным горадзе, дзе жывуць, як прынята гаварыць, нашы памяркоўныя, талерантныя, працавітыя суайчыннікі. Адкуль гэта ў нас? Думаю, ад элементарнай зайздрасці. Яны жылі не як усе. Галава сямейства — прадпрымальнік з добрым даходам. Яны заўсёды былі забяспечанымі людзьмі. І не трацілі свае грошы выключна на сябе, а ўкладвалі іх пераважна ў выхаванне дзяцей. Што ўжо падазрона для абывацеля. Яны добраўпарадкавалі свой вялікі дом, які Каця ў дзённіку называла «маленькай Англіяй». Для малодшай дачушкі, якую пару гадоў таму яны забралі з раддома, яна купляла самыя прыгожыя каляскі. Іх сабралася цэлая калекцыя. Усе дзеці добра вучацца, пастаянна ходзяць да рэпетытараў, іх возяць на мора і на экскурсіі ў розныя гарады. Як гэта можа быць, — разважаў зайздроснік, — калі крызіс у краіне, «наш чалавек у булачную на таксі не ездзіць», ці, правільней сказаць, не павінен ездзіць. Інакш трэба шукаць нейкія падводныя плыні. Вось і знаходзілі іх. Самае сумнае, што ўсё гэта ў людзях практычна незнішчальнае...

Хіба не заўважаў ты, дарагі чытач, як часам перакошваюцца твары навакольных, калі нехта паведамляе, што купіў лепшую, чым у іх, машыну, пабудаваў дом, уладкаваўся на добрую работу? Менавіта перакошваюцца. Я аднойчы гэта ўбачыла ўвачавідкі, калі ў вобласці заснавалі журналісцкі конкурс. У першы год далі адной журналістцы грамату пераможцы. Я яе добра ведаю, чалавек яна іранічны і да любых узнагарод і адзнак ставіцца па-філасофску. Дык вось, выходзім мы з ёй з залы, яна — з кветкамі і той граматай пад пахай, і сутыкаемся з калегамі — мужам і жонкай. І тут я жахаюся, бо ў іх літаральна перакошаныя твары, як ад моцнага зубнога болю. Мне аж шкада іх стала. І шкада якога-небудзь рэжысёра, што не ўбачыў такі характэрны тыпаж. Але ж гэта смешная дробязь у параўнанні з тым, якую разбуральную работу можа правесці агрэсіўная зайздрасць. Памятаеце, як у бессмяротным рамане «Майстар і Маргарыта» Алаізій Магарыч заехаў у кватэру Майстра? Ён перад гэтым напісаў, вядома, данос. Ну і Майстра адправілі ў псіхушку, а Алаізію ўручылі ключы ад утульнага паўпадвальчыка. Ды палова даносаў, калі не больш, у часы рэпрэсій была напісана з прычыны зайздрасці. Ахвяры знікалі, а даносчыкі займалі іх кватэры, пасады, месца ў грамадстве, а то і «прысвойвалі» любімых жанчын. Такія пісьмы пішуць і зараз. Дзякуй Богу, што рэакцыя на іх цяпер іншая.

Але зайздрасць знаходзіць іншае выйсце і здольная атруціць жыццё таму, каму зайздросцяць. Хоць і кажуць, што яна найперш раз'ядае душу самога зайздросніка, ды там часцей асабліва няма чаго і раз'ядаць. Тое, што Ніна Мацяш называла «душэўным чарноццем», без промаху страляе па навакольных. Таму трэба асцерагацца зайздроснікаў, па магчымасці, абыходзіць іх.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Шоу працягваецца

«ЦУДОЎНАЯ СЯМЁРКА» ПРЫРУЧЫЛА ЛЁД

На тэлеканале «Беларусь 2» з 16 лістапада ўдзельнікі шоу «Цудоўная сямёрка» пачалі дэманстраваць свае таленты ў фігурным катанні.

Здымачная каманда супрацоўнічала з прафесійнымі фігурыстамі, а ўдзельнікі мелі толькі чатыры дні, каб асвоіць гэты від спорту. Спачатку яны праходзілі кастынг: падавалі заяўкі, а потым на практыцы даказвалі сваё жаданне. І нават тыя, хто на пачатку толькі на каньках больш-менш упэўнена стаяў, у выніку, выйшаўшы на лёд, паказвалі «характары», бралі харызмай.

— Мы працавалі з Лядовым палацам дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы па фігурным катанні, і прафесіяналы здзіўляліся, бо звычайна на рэалізацыю такіх праектаў, як у нас, патрабуецца не менш чым паўгода, — прызнаецца аўтар і рэдактар праекта Аксана Вечар.

Гледачоў чакае захапляльнае змаганне, дзе будзе месца і яркім вобразам і эмоцыям. Не абышлося без яркіх момантаў і падчас здымак. Прычым па танальнасці яны былі розныя. Напрыклад, у фінале суддзя Наталля Іванова падышла неяк да стваральнікаў праекта і сказала, што яна ўсё лічыць удзельнікаў, а зразумець, чаму «Цудоўная сямёрка», не можа. Як аказалася, гэта з-за выбыцця некалькіх удзельнікаў шоу. Нехта, супаставіўшы свае сілы з рэальнасцю, адмовіўся, у іншых былі іншыя падставы. Так, напрыклад, планаваў выйсці на лёд Алег Пауля з групы «PALLADIUM», але ў першы дзень трэніровак ён упаў, давялося развітацца з шоу, бо ўрачы на два дні прапісалі яму пасцельны рэжым. Таму лічба сем напрыканцы праекта стала толькі ўмоўнай.

Як і ў першым сезоне, дзе былі паказаны спаборніцтвы па кёрлінгу, у камандах змагаюцца артысты, тэлевядучыя і гледачы. Думаецца, што прыхільнікам спявачкі Жанет, вядучага праграмы «Справа густу» Андрэя Бібікава, артысткі Моладзевага тэатра Настассі Бігбаевай будзе таксама цікава пабачыць іх у новых амплуа.

Пра перспектыву стваральнікі праекта гавораць асцярожна, каб не сурочыць. Аднак спадзяюцца, што ўдасца па аналогіі з першым сезонам зрабіць сем эпізодаў з рознымі відамі спорту, а потым сустрэцца з лепшымі з лепшых у суперфінале. Бо праца вартая, каб яе працягвалі, нават калі яна змяняе жыццё на некалькі дзён. У канцы ж усе непрыемнасці і цяжкасці забываюцца, а застаецца толькі лепшае...

Алена ДРАПКО.

Даты | Падзеі | Людзі

Сусветны дзень дзіцяці. Адзначаецца па закліку ААН у розных краінах у азнаменаванне прыняцця 20 лістапада 1959 года XIV сесіяй Генеральнай Асамблеі ААН Дэкларацыі правоў дзіцяці і Канвенцыі па правах дзіцяці (20 лістапада 1989 г.).

1717 год — нарадзіўся Георгій Каніскі, украінскі і беларускі царкоўны дзеяч, асветнік, прапаведнік, пісьменнік. У 1743 годзе скончыў Кіева-Магілянскую акадэмію, у 1745-1755 гадах — яе выкладчык, прафесар, рэктар. Ініцыятар адкрыцця Магілёўскай духоўнай семінарыі. З 1783 года — архіепіскап магілёўскі, член Свяцейшага Сінода. Свае ідэі выказваў у публічных выступленнях і царкоўных пропаведзях. Выступаў за распаўсюджванне асветы ў Беларусі. Кананізаваны Беларускай праваслаўнай царквой.

1945 год — пачаўся Нюрнбергскі працэс. Чалавецтва даўно навучылася судзіць асобных зладзеяў, злачынныя групоўкі, бандыцкія і незаконныя ўзброеныя фарміраванні. Міжнародны ваенны трыбунал у Нюрнбергу стаў першым у гісторыі вопытам асуджэння злачынстваў дзяржаўнага маштабу — кіруючага рэжыму, яго карных інстытутаў, вышэйшых палітычных і ваенных дзеячаў. Працэс працягваўся амаль 11 месяцаў. Перад Трыбуналам паўсталі 24 ваенныя злачынцы, якія ўваходзілі ў вышэйшае кіраўніцтва фашысцкай Германіі. Такога ў гісторыі яшчэ не было. Таксама ўпершыню было разгледжана пытанне аб прызнанні злачыннымі шэрагу палітычных і дзяржаўных інстытутаў — кіруючага складу фашысцкай партыі НСДАП, штурмавых (СА) і ахоўных (СС) яе атрадаў, службы бяспекі (СД), тайнай дзяржаўнай паліцыі (гестапа), Вярхоўнага камандавання і Генеральнага штаба. Суд не быў хуткай расправай над пераможаным ворагам. Абвінаваўчы акт на нямецкай мове быў уручаны падсудным за 30 дзён да пачатку працэсу, і далей ім перадаваліся копіі ўсіх дакументальных доказаў. Працэсуальныя гарантыі давалі абвінавачаным права абараняцца асабіста або пры дапамозе адваката з ліку нямецкіх юрыстаў. У зале суда і на месцах былі дапытаны сотні сведак, разгледжаны тысячы дакументаў. У якасці доказаў фігуравалі таксама кнігі, артыкулы і публічныя выступленні нацысцкіх лідараў, фатаграфіі, дакументальныя фільмы, кінахроніка. Дакладнасць і пераканаўчасць гэтай базы не выклікалі сумненняў. Усе 403 пасяджэнні Трыбунала былі адкрытымі.

1948 год — нарадзілася (вёска Рудка Пінскага раёна) Яўгенія Янішчыц, выдатная беларуская паэтэса. У 1963 годзе ўбачыў свет яе першы рукапісны зборнік вершаў «Першыя россыпы». Яе вершы пачалі друкавацца ў раённай газеце і рэспубліканскіх выданнях. У 1969 годзе яна прымала ўдзел ва Усесаюзнай нарадзе маладых паэтаў і пісьменнікаў у Маскве. У 1970 годзе выйшаў першы зборнік «Снежныя грамніцы». У 1978 годзе выходзіць кніга «Ясельда», у 1980-м — «На беразе пляча», у 1983-м — «Пара любові і жалю», за якую атрымала Дзяржаўную прэмію БССР імя Я. Купалы ў 1986-м. Пісала апавяданні, выступала ў друку з артыкуламі, рэцэнзіямі. Некаторыя творы паэтэсы (у тым ліку незавершаная паэма «Галалёд») былі надрукаваны пасмяротна. Вершы Я. Янішчыц перакладзены на англійскую, балгарскую, іспанскую, нямецкую, польскую, рускую, украінскую мовы. На словы паэтэсы кампазітары Р. Давыдаў, Ю. Семяняка, М. Юрко і іншыя напісалі песні.

Было сказана

Аляксандр ЕЛЬСКІ, пісьменнік, этнограф, гісторык, публіцыст:

«Ніводзін свавольны капрыз не здолее беспакарана адкінуць патрэбу гарманічнай разнастайнасці ў прыродзе».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Шакал. Карсак. Струк. Гара. Акот. Воўк. Туз. Руль. Лато. Фет. Дынга. Бандура. Рай. Неба. Арал. Фрак. Капшук. Шкала. Апалак. Горн. Рэктар. Тора. Яда. Платан. Крах. Нірвана. Кухар. Кабатаж. Ясельда.

Па вертыкалі: Хлебароб. Яршоў. Фланг. Акр. Кана. Фура. Дранка. Опера. Кара. Ліса. Тайна. Кірка. Трак. Покер. Вуж. Корак. Алах. Она. Нан. Кат. Карп. Марс. Мода. Нагата. Танкер. Лот. Бакара. Гарбуз. Авал. Канторка.

СЁННЯ

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.48	17.02	8.14
Віцебск —	8.43	16.46	8.03
Магілёў —	8.38	16.52	8.14
Гомель —	8.28	16.56	8.28
Гродна —	9.02	17.19	8.17
Брэст —	8.56	17.26	8.30

Месяц

Поўня 17 лістапада. Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Валерыя, Кірылы, Міхаіла, Фёдара, Фядота, Яўгена.* ***К.*** *Анастасіі, Эдзіты, Анатоля, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +7..+9°C	КІЕЎ +10..+12°C	РЫГА +5..+7°C
ВІЛЬНЮС +6..+8°C	МАСКВА +1..+3°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +4..+6°C

УСМІХНЕМСЯ

Запіс настаўніка ў школьным дзённіку дачкі Дар'і Данцовай: «Ваша дачка падрыхтавала даклад па біялогіі. Чытаю ўжо трэці тыдзень. Спадзяюся, што забойца не зебра».

Жонка прыходзіць дадому з торбай, праходзіць у залу:

— Дарагі, гэта вось табе.

Выкладвае піва, воблу, ракаў.

— А чаго ты, мілы, футбол не глядзіш? Табе прыгатаваць што-небудзь смачнае?

Муж:

— Моцна?

Жонка:

— Не вельмі, мілы: фара, бампер і капот...

На кухні я вельмі лёгка здымаю стрэс. Напрыклад, дастаю з халадзільніка бройлера, называю яго Юрыем Андрэевічам, адразаю ўсё, што захачу, апальваю на газавай канфорцы і павольна апускаю ў кіпень...

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 5031.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 19 лістапада 2013 года.